## Дню роднай мовы прысвячаецца

21 лютага ўвесь свет адзначае Міжнародны дзень роднай мовы. Для большасці нацыянальнасцяў, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі, роднай з'яўляецца менавіта беларуская мова. Роднай – значыць, любімай, дарагой, самай-самай. Беларусам многія могуць пазайздросціць: у спадчыну ім засталася па-сапраўднаму унікальная мова – самая мілагучная і самая старажытная сярод славянскіх.

Да гэтай даты ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі» прымеркавала цыкл мерапрыемстваў. У гэты дзень ва ўсіх бібліятэках установы на працягу дня супрацоўнікі плануюць размаўляць з наведвальнікамі на беларускай мове, знаёміць з творамі сучасных пісьменнікаў і аўтараў-класікаў беларускай літаратуры.

Акрамя гэтага, у бібліятэках раёна адбудуцца тэматычныя ўрокі, прагляды літаратуры, літаратурныя падарожжы. Кніжныя выставы пад назвамі: кніжная навігацыя «Чытаем на роднай мове», літаратурная мазаіка «Прыгожыя словы пра родную мову», выстава-прагляд «Роднаму слову – гучаць вечна» і інш.

Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі запрашае ўсіх жадаючых прыняць удзел ва ўсебеларускай дыктоўцы і анлайн-марафоне «Роднай мовы гук чароўны».

21 лютага ў Бучацінскай сельскай бібліятэцы пройдзе літаратурная гадзіна «Чытаем на роднай мове», у Жыліхаўскай сельскай бібліятэцы урок роднай мовы «Адкрый дзверы таямніцы», у Пацейкаўскай сельскай бібліятэцы-клубе падарожжа па творах беларускіх пісьменнікаў «Чытаем сваё – беларускае», у Семежаўскай сельскай бібліятэцы гульня «Погуляем у родныя словы».

Удзельнікі літаратурнага аб'яднання «Вясёлка» прысвяцілі вершы роднай мове.

**Ніна Канстанцінаўна Краўчанка**

**Родная мова**

Вы паслухайце, паслухайце
Як мова беларуская гучыць.
Як ручаёк бяжыць да рэчкі,
На каменчыках журчыць.

Як шапаціць калоссе ў полі
І ветрых гойдае вярбу.
І бусел белымі крыламі

Зноў ахіне маю журбу.
Як трапяткія сонца промні
Пранізваюць густы туман.
І  святло далёкай дзіўнай поўні
Падобна на міраж, падман.
Як кроплі расы на траве
Разнакаляровай вясёлкай зіхцяць,
Так і мова наша жыве
І ніхто не можа адняць.

**Ядвіга Генрыхаўна Малевіч**

**Родная мова**
Забываюць мову беларускую
Беларусы, шукальнікі свайго я.
Карабаватая яна, ці вузкая
Для разумення нас на планеце Зямля?
Для ўсіх краін свая не шумавінне,
Якую б чарпаком скідаць у вядро.
Мы ганарыцца сваёй моваю павінны –
Яна Айчыны ядро!
Усе мовы ў павазе,
Ды роднай мове быць у перавазе!
Каб наша родная мова гучала,
Не скідайце яе з размоўнага п’едэстала!

**Марына Коршук**

**Нашы словы**
У нашай мове беларускай роднай
Есць словы для пяшчоты і натхнення,
Есць словы для гаворкі моднай
Для моладзі, для новых пакаленняў.
Мы словы родныя ўжываем,
Каб выразіць нягоду, зайздрасць.
У запасе слоўным словы маем,
Каб паказаць і злосць, і ўпартасць.

Але найбольш любімымі, жывымі
Мы лічым словы ласкі, дабрыні,
Што дапамогуць нам дарогамі любымі,
Узляцець на шчасце-крылах да нябеснай вышыні.

На гэтых крылах завітаць да маці
Абняць яе, сказаць: "Люблю цябе!"
І словамі падзякі ў роднай хаце
Пацалаваць ікону толькі за яе.

Не трацьце часу на худыя словы,
На словы, што не могуць акрыліць,
А беражыце тыя словы роднай мовы,
З якімі нашы беларусы будуць жыць.